Ответить Настя не успела. Удары оглушили ее, а затем озверевшие казаки повалили ее на кровать и долго глумились над ее обнаженным телом.

V

Город стонал. Город выл под казацкой плетью. По ночам, когда черной пеленой укрывались гранитные улицы, какие-то тени шныряли по рабочей окраине, ломились в квартиры, забирали рабочих.

* * *

В лагере 1-го пролетарского конного полка было спокойно. Вдруг часовой заметил пробирающуюся к лагерю тень.

— Стой!

Тень остановилась.

— Мне нужно видеть т. Фролова!

. . . . . .

— Тов. командир, вас спрашивает какая-то женщина, можно впустить.

— Настя!

... Когда Настя кончила свой рассказ, Фролов, не говоря ни слов, подошел к ней. Его руки с любовью опустились на ее вздрагивающие плечи.

— Итак, ты с нами, ты, наконец, поняла кто наши истинные враги. Ну, а теперь куда пойдешь?

— Остаюсь здесь с вами.

— А Витя?

— У бабушки оставила, присмотрит за ним.

— Ладно.

VI

Весело в кочегарке. Пылают и трещат смолянистые бревна. Фролов окончил свой рассказ.

— Ну, а жена твоя, что поделывает?

— Беда с ней. Целый день занята, а теперь еще и в Осоавиахиме работает, так что по целым дням не вижу.

Потрескивают бревна.

— Итак, ты с нами, ты, наконец, поняла кто наши враги. Ну, а теперь куда пойдешь?
— Остаюсь здесь, с вами...



Сьцепаніда-дэлегатка

Ад дэлегаткі да члена ЦВК.

(Нарыс).

Сярод балот і цёмных лясоў доўгай істужкай расьцягнулася вёска. Пакрыўленыя хаты, з зялёнай страхой, з маленькімі вокнамі, у якіх шыбкі напалову пабітыя і замест іх рызьзё ці салома, стаяць прытуліўшыся адна да аднэй, як родныя сястрыцы. Цёмныя хмары злучыліся з сізымі туманамі балот і цяжкім панцырам апранулі вёску, і здавалася, што ніколі сонейка сюды ня кіне сваіх праменьняў, што людзі вёскі ніколі за цемрай ня ўбачаць шляху барацьбы з сваёй цяжкай нядоляй.

Але вось з боку гарадоў пачуліся водгукі грому. Здалёку бліснчэла маланка, а гром каціўся ўсё бліжэй ды бліжэй. На гушчары хмар маланка намалявала зьмяю. Шаснуў пярун. Расьсек сталёвы панцыр цемры. Сонейка заблішчэла. З сваіх хат, палёў, лясоў, пацягнуліся людзі шукаць шлях лепшага жыцьця і сустракалі барацьбітоў з фабрык і заводаў, якія йшлі навучыць іх і сумесна з імі змагацца з панамі.

З тэй пары прайшло дзесяць гадоў. Хаты стаяць таксама, але-ж замест старых ёсьць і новыя будынкі з вялікімі вокнамі (з гантовай страхой, пасярод вёскі існуе коопэрацыя, замест таго гандлёўшчыка, які за плячыма цягаў мех з вагой, дробнымі таварамі), і між імі стаіць хата Сьцепаніды. Ужо тры гады зьмяшчаецца ў ёй хата-чытальня, замест багоў па сьценкам раскіданы лёзунгі, усялякія малюнкі, партрэты правадыроў, працоўных мас. Цікавая хата. У старыя гады аб ёй нават ніхто ня ведаў і ня чуў, а зараз чырвоныя гальштукі піянэраў вывучаюць сьпевы дзён цяжкіх, як кроў пілі і ў карак гналі паны дзядоў і прадзедаў, а комсамольцы маладыя кіруюць гэтым хорам, жанчыны, хлопцы, дзеўкі маладыя, дзяды з паважнай барадою, дэлегаткі з карткай Леніна, трымаючы за пазухай, каб не папсаваць, усе зьбіраюцца ў нядзелю сюды—у маленькі будынак.

Ужо два гады ўшэраг абіраецца Сьцепаніда дэлегаткай, яна ліквідавала сваю няпісьменнасьць, зьяўляецца сябром праўленьня коопэрацыі, сябра с.-савету, а сёлета была абрана сябром цэнтральнае ўрады. Увайшла ў партыю і пацягнула за сабой свайго дзеда. Старая ўжо Сьцепаніда, шэсьцьдзесят гадоў, а не выглядае, магчыма даць сорак. Была ў Менску на Зьезьдзе Саветаў, першы раз ехала цягніком, нават першы раз убачыла ў вочы яго.

— Сёньня ў хаце-чытальні дэлегацкі сход. Сьцепаніда будзе рабіць справаздачу аб зьезьдзе,—гаманілі на вуліцы паміж сабой дзядзькі.—Кажуць, у Менску на танабілі езьдзіла, дык чуць ад страху не памёрла,—працягвалі гутарку сяляне. А тымчасам хата-чытальня напаўнялася людзьмі. Дэлегаткі амаль што ўсе прышлі на сход. Надыходзіў вечар. Запалілі цяпло. На лавах паселі дзяўчаты, апрануўшыся хусткамі; прыціснуўшыся, з боку падселі хлопцы. (Па сталу загрукацеў кулак). Жанчына сялянка спыніла прыватную гутарку. „Таварышы, сьціхніце, бо пачынаецца сход. Сёньня на абвестцы стаіць пытаньне, як Сьцепаніда была ў Менску. Ніякіх дабаўленьняў няма?“ „Няма“, закрычэлі ўсе раптам. Старшыня сходу села на лаўку, а Сьцепаніда надзела акуляры на вочы, трымаючы паперку ў руцэ, на якой вялікімі літарамі было напісана, аб чым яна павінна казаць. Супакойна пачала Сьцепаніда сваю справаздачу, роўна лілася яе гутарка аб тым, што парашыў зьезд наконт паляпшэньня жыцьця рабочага і селяніна і галоўным чынам застанавіліся на тым, якія мерапрыемствы вызначыў зьезд па Народнаму Камісарыяту Зямля-

Сьцепаніда адчытваецца...

робства, аб тым, што трэба сялянам узмацніць працу мэліярацыі, што ў пяць гадоў паб'юць усе вёскі на пасёлкі (што ўсім будзе даволі зямелькі), а дзеля культурнага зямлякарыстаньня трэба ўзмацняць і будаваць машынныя таварыствы і сельска-гаспадарчую коопэрацыю.

У час дакладу паціхоньку сьмяяліся ў прыгоршню маладыя і старыя. „Паглядзеце, у Сьцепаніды акуляры—гэта ёй у Менску далі“. „Глядзеце, якія ў яе вочы“. „Таварышы, цішаця“, закрычэла старшыня сходу, „не перашкаджайце“, і далей працягвала Сьцепаніда сваю гутарку. Казалі аб тым, што будзе абавязковае вучэньне, што больш няпісьменных дзяцей у нас ня будзе. Шмат чаго расказвала

Сьцепаніда. Сяляне слухалі і з увагай глядзелі прама ў рот Сьцепанідзе. Спыніўся даклад. Пасыпаліся пытаньні і сумесна спрэчкі і больш усяго сяляне скардзіліся ёй, як прадстаўніку ўлады на свой саўхоз, што і кароў забіраюць, што зра трымаюць зямельку, трэба даўно раздаць сялянам, што і лясьнік за дрэва штрафы накладае і г. д. Перашкаджалі нават выказвацца дэлегаткам, якія з свайго боку запытваліся, ці скора будзе прадзільны станок, а ці будзе ў нас школа пабудована, ці дашлюць фэршала, ці будзе ў каапэрацыі сукно і фарба. А галоўнае, гэта цікавіла, ці будзе сёлета вайна ці не. Слухайце таварышы, пачала Сьцепаніда, чаго вы скардзіцеся, тое ня так, гэта ня гэтак. Успамятайце як было, калі пан жыў. Як ён браў нашу жывёлу затое, што яна вады ў яго крыніцы напілася, ці калі нас ганяў панскі лясьнік, калі мы пойдзем у лес за грыбамі, ці за ягадамі, зловіць, хустку зьдзярэ і ў каршэнь наложыць. А зараз усе мы павольна ідзем да лесу, гукаем адна другую па лясу, сьпяваем сьпевы і нікога не баімся. Яскрава, калі вы паедзеце ў лес дрэва красьці, ці жывёлу пагналі ў маладняк, вас за гэта ўлада па галоўцы не пагладзе. Зьвярнула ўвагу дэлегатак Сьцепаніда на жадаючую бойку. Слухайце, дэлегаткі, трэба нам з'арганізаваць гурток вайсковы і трэба каб усе дэлегаткі ўвайшлі сябрамі Асоавіяхіма,—чым лепш будзе з'арганізована насельніцтва ў вайсковыя гурткі, тым мацней будзе наша Чырвоная армія, тым больш забясьпекі на даўжэйшы мір. На гэтым спыніўся сход.

З гоманам пачалі сяляне выходзіць з хаты. „Успамятайце, браточкі, як усе мы сьмяяліся, калі Сьцепаніда пайшла ў дэлегаткі", казаў малады дзяцюк, „а во бачыш, і ў Менск езьдзіла, і грамаце наўчылася, а ўсё праз дэлегацкі сход. Чалавекам стала".

„І акуляры пацапіла" зарагатаў Макар. А ноч з бліскучымі зоркамі спусьцілася на зямлю і луна асьвяціла ўсьміхаючыяся твары сялян.

В. Наздроўская.

В ряд с другими.

Уже близится время перевыборов.

Встречаются, обсуждают как бы лучше отчитаться.

Ведь отдают рапорт перед партийной ячейкой. Хочется показать, что успели.

В присутствии беспартийных рабочих, работниц и жен рабочих, на открытом собрании ячейки КП(б)Б, после доклада тов. Танаевцевой—о задачах партии в работе среди женщин—робко на эстраду вступают одна за другой делегатки.

Делегатка Ивкина, работница.—Если я сегодня понимаю, что делается в Китае—это значит год не пропал даром.

Подробно останавливаясь на составе делегатского собрания и его работе, тов. Ивкина заявляет, что больше всего ее сейчас интересует работа Осоавиахима. Чую, что здесь нужно напречь все усилия, в любую минуту быть готовой.

Зимой занималась в белорусском кружке, работала в кооперативной секции.

Теперь прошу ячейку прикрепить ко мне кого либо из партиек для индивидуальной обработки. Хочу и дальше приобретать знания.

Делегатка Гринман.—Останавливаясь на программной части работы делегатского собрания, из которых она, главным образом, выдвигает вопросы построения Советской власти, вопросы промышленности, бытовые, по охматмладу и т. д., она переходит к своей практической работе.

— Прикреплена к Горсовету, работаю в секции здравоохранения, обследовала больницу.

Знала положение больницы раньше, ознакомилась и теперь, отмечает достижения.

— Обследовала колонию в Лошицах, там есть часть нездоровых детей, главным образом рахитиков. Понимают, что это еще с прошлых годов. Говорила с обслуживающим персоналом, договорилась по некоторым вопросам.

Вместе с комиссией обследовала одну из кооперативных лавок. Интересовалась снижением цен, обращением с пайщицами, качеством и свежестью продуктов. Одна пайщица указала, что плохой запах уже несколько дней в кооперативе стоит. Идет со стороны кладовой. Попросили заведывающего открыть кладовую, оказывается из кладовой мусорную яму сделали.

Сказали заведывающему убрать это и когда через некоторое время пришли еще раз—мусорной ямы уже не было.

Еще зимой занималась в кружке по ликвидации неграмотности. Делала успехи. Сейчас перехожу в вечернюю школу.

Кончила. Из собрания вопрос. Как бы вы поступили, если бы муж ваш пил и бил вас.

— Раз'яснила-б ему, что вредно пить, попросила бы наших руководителей сделать доклад о вреде напитков. И целый ряд других вопросов.

Делегатка Форина.—Делегатское собрание проводило экскурсии—в столовые, ясли, типографию, заводы. Цель—ознакомить делегаток с производством, состоянием промышленности, а главным образом интересовались, какую роль занимает работница в производстве—говорит она.

Моя практическая работа—МОПР. Завербовала 135 членов МОПР'а, участвовала в кружечных сборах в пользу МОПР'а и флота.

В пользу политзаключенных Западной Белоруссии собрала более 12 рублей по подписному листу.

До того, как была выбрана делегаткой, имела глаза, но не видела, имела уши, но не слышала.

Партия дала знания—прозрела.

Вопрос. Скоро наступит судный день, будете ли поститься и как по вашему мнению нужно ли поститься.

— У меня судный день такой же, как и 365 других дней в году. Я знаю, что Советская власть не притесняет верующих, а по моему поститься не надо.

Общее настроение—будем и впредь работать с такой преданностью, как и до сих пор.

Г. Ефроимская.

Раньше даже не знала, кто управляет городом.

(Октябрьский Райком КПБ)

Сегодня текстильщицы заслушивают отчет своей делегатки Огородниковой. Страшно ей с непривычки. Начинает дрожащим голосом: „мне первый раз приходится отчитываться. Верно у меня ничего не выйдет".

Сообщила состав делегатского собрания. Из 122 делегаток, 10 было неграмотных. Теперь они уже ликвидировали неграмотность. На собрании разбирались вопросы о промышленности, профсоюзах, кооперации, нацполитике.

Дальше Огородникова продолжать не может. Какой-то комок подступает к горлу и мешает говорить. Замолчала. „Смелей, смелей Огородникова, тут ведь все свои, работницы. Говори спокойно, как у себя дома"—подбадривают ее окружающие. „Ты кратко скажи, как работало делегатское собрание и что ты там делала. Ведь ты уже выступала в клубе Карла Маркса.

Но Огородникова расстроена. Молчит. Решили текстильщицы помочь ей. Пусть Огородникова отвечает на вопросы.

Посыпались вопросы. Огородникова отвечала сначала односложно. Но вот спросили о ее работе и о том, что ей дало делегатское собрание. Стала отвечать. Оживилась. Нагрузку она имела все время. Раза 4 занималась в профсекции. Затем в секции труда. Участвовала в комиссии по обследованию безработных умственного труда (приняли ряд постановлений по устранению замеченных там неправильностей).

„Мне делегатское собрание дало очень много. Я раньше даже не знала, кто управляет городом. Думала, что правит один человек. Теперь вижу, что в управлении городом участвуют даже делегатки, прикрепленные к Горсовету".

В заключение Огородникова выражает благодарность Коммунистической Партии, которая из отсталых женщин воспитывает через делегатские собрания активных общественниц. Обещала и дальше продолжать активную работу в секциях.

Все высказывающиеся отмечали происшедшую перемену с Огородниковой с прошлого года: „Теперь она хоть не сразу, но отчиталась, а раньше от нее слова нельзя было выжать. Она прямо переродилась. Полностью оправдала себя, как делегатка. Работая в секциях всегда приходила в Женотдел делиться впечатлениями о состоянии работы, которую ей приходилось обследовать. Ни от какой работы не отказывалась, отметила присутствовавшая на собрании Зав. Женотделом Вишнинская.

Надавали Огородниковой массу советов, главное—учиться. Нужно продолжать работу, а Завком должен помогать Огородниковой в ее дальнейшем развитии.

Э. Шапиро.

▼▼▼▼▼▼▼▼▼▼

Почаще к отчету!

Недовольны работницы ст. Минск Зап. жел. дорог, жалуются: „Выбираем мы делегаток, а что они делают сами не знаем. Спросишь о работе или о чем говорится на делегатских собраниях—отвечают:

„Сходи и послушай сама,—тогда будешь знать".

Таких ответов со стороны делегаток не должно быть, коммунистическая партия ставит перед делегаткой задачу не только самой учиться, но и делиться своими знаниями—тем, что услышала или узнала она—благодаря своему положению делегатки—с выбиравшими ее женщинами.

Правда, иногда делегатки работают слабо, плохо посещают делегатские собрания и им не о чем рассказать, а избиравшие мало интересуются их работой.

Чтобы знать, как работает делегатка и чтобы она могла делиться своими знаниями и опытом с другими женщинами, необходимо хоть изредка ставить на женских собраниях отчеты делегаток. Не желающих учиться и работать нужно отзывать раньше срока и посылать таких, которые выполнят возложенные на них задачи.

Бывшая делегатка.

От редакции. Выдвинутый момент предусмотрен инструкцией о работе дел. собр. 1927-28 году (выработанной ЦК КПБ), где говорится, что делегатки, непосещающие дел. собр. и не желающие работать, должны быть заменены другими.

Работницы, избравшие делегаток, должны следить за тем, чтобы это правило проводилось в жизнь.

Тов. Низовцева, работница ф-ки „Красная Березина". Работает на производстве 14 лет. В 1926 году избрана была делегаткой. Вступила в партию, является членом фабкома, председателем производственно-технической комиссии. Выдержала экзамен в Витебскую Совпартшколу.

Тов. Жуковская, работница ф-ки „Красная Березина". Работает на производстве 16 лет (с перерывом) делегатка с 1926 г.

— **У вёсцы Слабада Самахвалаўскага раёну** (Меншчына) **жанчыны паслухалі агранома і пасадзілі буракі ў радкох**, а не ў шырокіх градах,—і вырасьлі на дзіва, ёсьць нават на 800 гр. (2 фун.) бурак. Лён таксама пасеяны па радзе агранома, вырас, хоць на выстаўку вязі.

Ц. Сьвірыноўская.

— **У вёсцы Маторава (Меншчына) шэфы 1-й савбальніцы, радзільнага дому і райжанарганізатар абралі** дэлегатак, далі членскія кніжкі.

За год правялі сходаў 6, выпісалі літаратуру.

У 1926 г. сходаў было менш, былі арганізаваны ясьлі.

А ў 1927 г. нічога няма, правялі толькі 2 сходы, на якіх урач чытаў лекцыі.

Ад лютага месяца шэфы і носу не паказалі, заснулі мусіць.

Т. Т-ка.

— **У м. Бабры (Аршанскае акругі) 22 дэлегаткі.** Дэлегацкія сходы відавочна вырашчваюць з сялянак палітычна-сьвядомы актыў. Так, адна дэлегатка, т. Паўлоўская, зараз зьяўляецца членам Бабруйскага местсавету, дзе падчас замяняе нават старшыню местсавету.

Н. Раманоўскі.

— **Я была избрана делегаткой в 1926 году.** Работала в секции Охматмлада, участвовала в обследованиях жизни детей на дому и в яслях, работала в секции горсовета.

Сначала мне это давалось очень трудно, я не могла излагать свои мысли.

Теперь в этом направлении у меня есть некоторые успехи, а самое главное, я стала смелее и могу немного разбираться в вопросах.

М. Стаховская.

Перевыборы делегаток на дрожжевом заводе „Пролетарий".

(Минск).

Как водится по обыкновению на заводе, окончив работу в 5 ч. вéч., работницы разбегаются, все торопятся скорей домой, у каждой есть свои дела.

А вот в день перевыборов делегаток почувствовалось возбужденное настроение и несмотря на то, что в этот день работу закончили раньше времени, т. е. в 3½ часа, но все терпеливо ждали: в 5 часов назначено собрание, на котором надо быть всем. В этот день работали 22 работницы, а 4 были выходные, но и они выполнили свой долг, явились на собрание. Всего было 26 работниц.

Собрание началось: заслушали доклад о перевыборах делегаток и перешли к отчету о работе делегатки т. Новиковой.

Тов. Новикова в своем отчете подробно освещает всю работу делегатского собрания, особенно подчеркивает вопрос о практической работе делегаток в разных секциях Горсовета, к которым делегатки были прикреплены.

„Я, говорит т. Новикова, к Секции Горсовета не была прикреплена, но зато у меня была нагрузка по кооперативной линии, как член лавочной комиссии и уполномоченный ЦРК.

Делегатские собрания посещала аккуратно, исключая единичных случаев, когда я не могла быть (это когда надо было быть на кооперативном совещании).

Делегатское собрание мне очень много дало. Вопросы советского строительства и политические вопросы, о которых я раньше не имела понятия, стали сейчас для меня ясны. Можно получить от делегатского собрания много, если, конечно, аккуратно посещать.

Начались прения. Заговорили работницы завода, а также и рабочие. В своем слове, работница, тов. Каплан одобряет работу т. Новиковой (как отсталой прежде работницы). „С нее больше требовать нельзя. Она сумела нам подробно передать все, что она успела на делегатском собрании".

И еще высказывались ряд работниц и рабочих.

Вот приступили к выборам. Намеченные кандидатуры надо обсудить всему собранию, кого послать, кто принесет пользу, на кого можно возложить эту задачу. И вот, обсудив, решили послать на делегатское собрание и выбрали 4 делегатск.

На другой день все еще обсуждали да толковали работницы, что хороших делегаток выбрали, надо только стараться, чтобы хорошо посещали.

Работница завода **Цявловская.**

От редакции. О том же собрании работниц завода „Пролетарий" получена заметка рабкора Покровского, в которой он также отмечает присутствие мужчин на собрании делегаток: „Перевыборы делегаток, как будто бы на первый взгляд бабье дело, но рабочие поняли, что это дело не одних работниц, а общее дело, дело важное и ответственное и пришли почти все на 100 проц."...

Работніцы і сялянкі! Пішэце, як ідуць перавыбары дэлегатак, пішэце пра практычныя дасягненьні дэлегацкіх сходаў, а таксама і паасобных дэлегатак.

СТРОИМ ЯСЛИ



Яслі і пляцоўкі заваявалі аўтарытэт сярод насельніцтва. „Яны летам у вёсцы неабходны"—гавораць сялянкі, дзеці якіх былі ўжо ў яслях. Гэта правільна! У тых вёсках, дзе гэта зразумелі добра, сяляне ставяць пытаньне аб далейшым утрыманьні яслеяў за свой кошт.

Пастанавілі арганізаваць ясельны фонд.

(Вёска Горна, Менскай акругі).

Яслі ў вёсцы Горна ўжо існуюць другі год. Сялянкі добра ведаюць карысьць ясель і з вялікай ахвотай нясуць туды дзяцей. Яслі разьлічаны на 30 дзяцей.

У сэнсе грамадзкай працы зроблена наступнае: праведзена 4 сходы і 2 лекцыі. Сялянкі на сходзе вынесьлі сваю прапанову арганізаваць ясельны фонд, каб у наступным годзе адчыніць яслі на свае сродкі. Спадзяемся, што ў канцы верасьня фонд будзе арганізован.

Дзеці ў яслях прывыклі да рэжыму дня. Кожнае дзіцё ведае сваё ложка і сваё месца каля стала, свой рушнічок. Гэта ў нас таксама вялікае дасягненьне, бо ў першы час дзеці вельмі цяжка прывыкалі да ясельнага рэжыму.

Кепскавата трохі, што ў нас няма цацак для дзяцей.

Шостак, Зэлкінд, Юдзянка і Войцік.

Праца сельскіх ясель у мястэчку імя Леніна.

(Горацкі раён, Аршанскай акругі).

Ужо сем тыдняў, як у нас адчынены яслі. За кароткі тэрмін свайго існаваньня яны змаглі заваяваць аўтарытэт.

Маецца ў нас 25 дзяцей. Невялікі лік з іх хварэе рахітам, і за гэтымі дзяцьмі вядзецца асабліва пільны дагляд, дзякуючы чаму многія з іх зараз акрэплі і пачалі добра хадзіць (у пачатку паступленьня ў яслі яны чуць трымаліся на нагах).

Але мы не абмяжоўваемся толькі гэтай працай. Мы імкнемся добра высьветліць сямейнае жыцьцё іх бацькоў, і часта бываем у іх дома, дзе вядзем у вольны час гутаркі сярод жанчын. Да гэтай працы мы таксама прыцягваем урача.

Мы ўсё больш і больш уцягваем матак у працы мацярынскага камітэту, у склад якога ўваходзяць 7 матак, 2 прадстаўнікі ад пэрсаналу, старшыня сельсавету і старшыня рабочкому.

Х. Горфінкель.

Прыклад таго, як не павінны працаваць яслі.

У Талачынскім раёне (Аршаншчына) існуе двое ясель: у Гарадзецкім і Славенскім сельсаветах.

Праца пастаўлена парознаму ў кожным з іх. *У Славенях* ходзіць у яслі 19 асоб. Недахват у яслях тое,—што стала ходзяць у яслі 15 дзяцей, а 5 дзяцей прымаліся камісіяй аж 4 разы. Дзеці, якія хадзілі ў яслі кожны дзень, добра паправіліся, і іх бацькі вельмі здаволены яслямі. Яшчэ, як адзін недахват ясель, трэба адзначыць неправядзеньне ніякай працы з мацерамі.

Ня было аж да 9 жніўня мэд. абгляду, а яслі існуюць два месяцы.

Калі ўзяць *яслі ў вёсцы Гарадцы*, дык тут зусім іншае. Няма перамены харчу; амаль кожны дзень гарох і фасоль, і сялянкі, калі з імі праводзілі сход, казалі: „тым, чым іх кормяць у яслях, дык мы і дома ня кормім". Калі сталі высьвятляць, чаму такі малы процант дзяцей у яслях, дык маткі скардзіліся, галоўным чынам, на кепскі дагляд. Пасьля праверкі гэтых скаргаў выявілася, што гэты недахват меў месца ў працы ясель.

Ня гледзячы на тое, што на месцы ёсьць фэльчар, мэдыцынскае абслугоўваньне слабое. Фэльчар ня лічыў да гэтага часу, што яго вока там неабходна. Калі да яго зьвярнуліся, ён кажа: „каб мне далі афіцыйную паперку, то я-бы сачыў за працай ясель, а таксама за здароўем дзяцей".

Яшчэ адзін недахват: калі мацеры пры адчыненьні ясель пастанавілі дзяжурыць па чарзе і пачалі прыходзіць, дык загадчыца ясель ня стала пускаць іх. Адна сялянка скардзіцца: „Я прышла, а яны пазакрывалі дзьверы і кажуць: „ідзі, ідзі, яны ўжо паабедалі" (гэта казала загадчыца яслямі).

Хамякова.

Работа детских ясель в д. Усса и Кухтичи.

(*Минский округ*).

В первых числах июля с-г. в Узденском районе в д. д. Усса и Кухтичи открыто двое яслей, из расчета на 25 детей каждые. Открытие указанных яслей было проведено за счет средств,

отпущенных по бюджету, а также за счет средств шефобщества и местных деревенских организаций.

Был организован материнский комитет, которым проделана большая работа как в смысле популяризации яслей, так и в деле оказания материальной помощи яслям со стороны родителей.

Что касается дер. Кухтичи, то здесь эта помощь выражена в меньшей мере—за все время передано 40 кварт молока, 20 штук яиц и перевозят продукты.

Нужно отметить, что в деревне В. Усса, где ясли устраиваются не первый раз, отношение к ним очень хорошее, и крестьяне, даже беднейшие, охотно стараются оказывать помощь, что же касается деревни Кухтичи, где ясли организованы впервые, там крестьянство еще недостаточно осознало пользу ясель и мало помогают. Зажиточные крестьяне, дети которых не принимаются в ясли, стараются подорвать авторитет ясель.

Б. Спорыхин.

Центральная молочная кухня себя оправдывает.

(Гор. Минск).

Одно из достижений, имеющихся у нас в Минске, по облегчению матерям ухода за детьми и для здорового аккуратного питания грудных ребят—это центральная кухня при доме грудного ребенка. Раньше снабжение молоком происходило в каждой из консультаций отдельно, теперь это сосредоточено в одной центральной кухне.

С 6 часов, а то и еще раньше, уже начинает работать кухня. Распаливаются печи, начинают мыть бутылки на разливку молока, приготавливают различную посуду.

В 7 часов работа в полном разгаре.

Работа кипит во-всю, чтобы успеть до 12 часов все приготовить, разлить по бутылочкам, наклеить соответствующие семям наклейки и отвести во все консультации города Минска.

Работают над этим почти исключительно женщины, в числе 9 человек. Работа довольно тяжелая, приходится применять довольно много физического труда и зачастую бывает, что при потребности в какой-нибудь день большого количества молока, работницы не успевают до срока разлить молоко. Нужны, как видно, еще 1-2 человека и тогда не придется им уже все 6-8 часов, в буквальном смысле ни минутки не отдохнув, работать, чтобы аккуратно сделать и поспеть дать ожидающим ребятишкам в разных частях города свои ежедневные порции молока.

Кухня теперь в среднем выпускает до 10.000 бутылок смеси молока и каши, от 100 до 300 гр. каждая. Самый большой потребитель—это дом грудного ребенка, а остальное разбирается 3 консультациями города.

Всего снабжается 350-400 детей грудного возраста. Кухня изготовляет для своих надобностей масло, сливки и т. д. Собираются еще закупить машины для механического разлива молока, механического мытья бутылок и т. д.

Расходуется в день в среднем 20-22 рубля на продукты для смесей, до 20 р. на персонал и другие расходы, всего около 40 рублей в день.

Стоимость бутылочки смеси—4 коп.

Кухня себя вполне оправдывает в деле снабжения здоровой пищей для грудных ребят, так и в помощи матерям в их кормлении.

Мусина.

Дети за обедом.

Як убіраць і хаваць на зіму карняплоды.

Калі ніжнія лісьця адгібаюцца да нізу, жаўцеюць і адвальваюцца, дык карняплоды пачалі пасьпяваць.

Няможна абламываць зялёныя лісьці ў карняплодаў. Ад абламываньня часткі лісьцяў зьмяншаецца ўраджай карней.

Абламываць батву можна толькі дней за 2-5 да ўборкі ўраджаю.

Ва ўмовах Беларусі прыходзіцца ўбіраць карняплоды іншы раз раней, чым таго патрабуе навука (гэта бывае ў тых выпадках, калі наступаюць раньнія замаразкі).

Калі маецца ў гаспадарцы некалькі гатункаў карняплодаў, напрыклад: буракі, марква, бручка і г. д., то ў першую чаргу трэба ўбіраць буракі, потым маркву, турнэпс і ў апошнюю чаргу—бручку. Уборку трэба праводзіць пры сухім надвор'і.

Уборка.

Спачатку ўсе буракі выцягваюць з зямлі і складаюць у круглыя кучы—карэньнямі ў сярэдзіну, а лісьцем надвор.

Потым прыступаюць да ачысткі карняплодаў. Лісьці абразаюць ножыкам. Пры гэтым абразаецца і частка мякаці так, каб лісьці не развальваліся, а трымаліся разам. Зямля з карэньняў ачышчаецца тупым бокам ножыка. Хвасты не абразаюцца (з абрэзанымі хвастамі корні больш загніваюць).

Ачышчаныя корні ўзноў складаюцца ў круглыя кучы і накрываюцца батвой. У такім выглядзе корні доўга могуць ляжаць да часу канчатковага захаваньня іх на зіму.

Неачышчаным карняплодам няможна доўга ляжаць у кучах, бо яны тады хутка загніваюць зімой. Пасьля ачысткі, наадварот, карняплодам неабходна некалькі дзён паляжаць у кучах, каб яны добра прасохлі. Захованыя на зіму адразу пасьля ачысткі карняплоды пачынаюць хутка загніваць.

Гэта ёсьць правіла для ўсіх карняплодаў.

Захаваньне карняплодаў.

Існуюць два спосабы захаваньня. Першы спосаб у пагрэбах і варывеньках, і другі спосаб проста на зямлі ў кучах.

У варывеньках лепш захоўваць, таму што, папершае—лёгка ў любы час наглядаць за карняплодамі, падтрымліваць у варыўні належнае цяпло і паветра.

Падругое—пры захаваньні ў варыўні не патрэбна пабудова асобнай пакрышкі кожны год на зіму, а пры захаваньні на зямлі яна патрэбна кожны год новая.

Патрэцяе—у варыўню лёгка карняплоды сыпаць і браць назад на харчаваньне скаціне ўвесь час зімой, і кепскае надвор'е не перашкаджае гэтаму.

Карняплоды лепш усяго захоўваюцца пры ½-1 градусе цяпла і калі ў памяшканьні суха.

Супроць варыўні можна сказаць толькі тое, што пабудова іх у належным выглядзе даволі дорага каштуе.

Таней каштуе захаваньне карняплодаў у кучах проста на зямлі.

Кучы карняплодаў лепш зьмяшчаць блізка каля сядзібы. Тады лягчэй наглядаць за імі, і менш патрабуецца працы для перавозкі на скотны двор.

Месца выбіраецца роўнае і сухое, каб да кучы не падыходзіла вада. Разьмер кучы такі: шырыня (унізе) два мэтры (мэтр—1½ арш.) вышыня 1-1½ мэтры, даўжыня бывае розная, у залежнасьці ад колькасьці карняплодаў. Звычайна даўжыня бывае 10 – 12 мэтраў.

Разьмяшчаюць кучы ўдоўж з поўначы на поўдзень. Пры такім разьмяшчэньні вясеньняе сонейка менш прагравае кучы і не перашкаджае карняплодам.

Кожная куча павінна мець выцяжную трубу. Труба будуецца так: на сярэдзіне таго месца, дзе будзе куча, удоўж выкапваецца канаўка, пакрываецца рэдка жэрдзямі альбо дошкамі, каб пакрышка мела выгляд рашоткі. Можна канаўку закідаць гальлём, тады не патрабуецца дошчак і жэрдзяў.

Пасьля таго, як канаўка пакрыта ці запоўнена гальлём, наверх накладаюцца карняплоды.

Вельмі важна правільна злажыць карняплоды ў кучу. Гэта робіцца так. Убіваецца па кутох кучы чатыры калы. Паміж калоў удоўж нацягваецца шнур, і па шнуру накладваецца першы рад карняплодаў, галоўкамі на двор, а хвастамі ў сярэдзіну.

Паміж радкамі карняплоды накідваюцца ў беспарадку. Наступныя надворныя радкі накладваюцца такім-жа парадкам, як і першы радок, толькі ўжо бяз шнура. К верху куча паступова звужваецца. Зложаная куча павінна мець выгляд двухскатнай страхі.

Пакрываюць кучы спачатку саломай, а зьверху зямлёй. Таўшчыня пакрышкі павінна раўняцца тэй глыбіні, на якую прамярзае глеба. Пласт саломы павінен быць ад 15 да 30 сантымэтраў. Пяшчаная глеба прамярзае глыбей, таму і пакрышку ў такіх выпадках трэба рабіць мацнейшую.

Каб карняплоды ў кучы не сагрэліся, трэба не абсыпаць кучу зямлёй адразу да належнай таўшчы-

ні, а абсыпаць яе паступова, некалькі разоў, па меры ўзмацненьня марозаў.

Калі месца нявысокае, то неабходна вакол кучы выкапаць канаву для адводу дажджавой і сьнегавой вады.

Правільна сабраныя, правільна зложаныя ў кучу і як сьлед пакрытыя карняплоды могуць ляжаць да вясны і не загніваць.

Калі зімой бяруцца карняплоды, то трэба гэтае рабіць як мага хутчэй, каб не ахладзіць тых, якія застаюцца ў кучы.

Мураўёў.

Праўда агранома.

(Меншчына, Крупіцкі с. с.).

Сялянкі вёскі Пазьдзеркі першы год сеюць карняплоды. Ураджай добры. Буракі парасьлі па 3-4 фунты, турнэпс парос да 3-4 фунтаў.

Цяпер сялянкі ўбачылі праўду агранома і кажуць: шмат будзе прыбытку ад кароў, і бульбу зьвязём у крахмальны завод.

Сялянкі зьбіраюцца ка дню ўраджаю везьці на выстаўку свае карняплоды і другія культурныя травы, напрыклад: віку, сэрадэлю. **Цыра С-кая.**

250 пудоў вікі і 1.200 пудоў турнэпсу з дзесяціны.

(Меншчына).

У вёсцы Пазьдзіркі (Самахвалавіцкі раён), як сталі гаварыць пра мэліарацыю, дык мужчыны трохі супроць былі,—не хацелі, казалі: „як гэта на балоце будзе расьці культурная трава, калі балацяная не расьце".

Калі жанчыны настаялі, каб правесьці мэліярацыю, арганізавалі таварыства і пайшлі капаць канавы.

У мінулым годзе зрабілі паказальны вучастак на адну дзесяціну—засеялі віку, дык накасілі болей як 250 пудоў, парасла ў мэтр вышынёю.

Сёлета на паказальным вучастку, апрача вікі з аўсом і сэрадэлі, засеялі і турнэпс на поўдзесяціны, атрымалі каля 600 пудоў. **Ц. Сьвірыноўская.**

Сялянкі будуюць пановаму гаспадарку.

(Узьлянскі с.-с., пасёлак Аляксандрава, Меншчына).

Сьпярша мужчыны былі супроць перавядзеньня гаспадаркі з трохполкі на шматпольле, казалі, што хлеба ня будзе.

Але жанчыны пачалі гаварыць: навука кажа, што гэта лепш, дык мусіць і лепш. І так згадзіліся мужчыны, перайшлі на шматпольле і пачалі сеяць культурныя травы і карняплоды, напрыклад: канюшыну, віку, сэрадэлю, карняплоды (бульбу, буракі, рэпу, турнэпс, моркаў, бручку і г. д.), зямлю ўгнойваюць штучным насеньнем (лубінам, мінэральнымі ўгнаеньнямі), дык атрымалі добры ўраджай у гэтым годзе, у два разы большы, як у мінулым годзе.

Напрыклад: жыта з капы (60 снапоў) 5-6 пудоў, а ў гэтым годзе 7-8 пудоў, і таксама ярына болей у два разы. Агарод расьце ўсім на дзіва, шмат засеялі карняплодаў у градах, і вырасьлі надзвычайна добра: ёсьць буракі па 800 грамаў, а морква да 200-300 грамаў.

Скаціна пародзістая, напрыклад: сьвіньні ангельскай пароды (адна сьвіньня ангельскае пароды, калі ёй было год і 4 месяцы, важыла 17 пудоў), жарабец чорны пародзісты вышынёй $2^1/_2$ аршыны.

Палатно вырабляюць саматканае, хоць на выстаўку вязі. Прыгожа вышываюць пасьцілкі, коўдры, як каўры і г. д.

Ц. Б. Сьвірноўская.

Рыхтуйцеся да „Дню ўраджаю".

Па прыкладу мінулых гадоў сёлета шырокія масы сялянства будуць сьвяткаваць „Дзень ураджаю". Пачатак гэтага сьвята 14 кастрычніка. К гэтаму часу селянін зможа сабраць з поля сваё збожжа, скончыць працу на полі і дома і падвесьці вынікі сваіх гаспадарчых дасягненьняў за мінулы гаспадарчы год.

Сьвяткаваньне „Дню ўраджаю" павінна, галоўным чынам, праходзіць у напрамку высьвятленьня вынікаў перабудоўлі сельскае гаспадаркі па соцыялістычнаму шляху.

У „Дзень ураджаю" трэба паказаць выгаднасьць новых форм—культурных і каляктыўных у параўнаньні са старымі, адзіналічнымі.

У „Дзень ураджаю" трэба падагуліць дасягненьні, якія маюцца ў сельскай гаспадарцы ў раёне наогул і па паасобных галінах.

У „Дзень ураджаю" савецкія і каляктыўныя гаспадаркі, пасёлкі, перадавыя вёскі і паасобныя гаспадаркі павінны паказаць свае дасягненьні ў справе павялічэньня ўраджайнасьці і прыбытковасьці гаспадаркі.

„Дзень ураджаю" павінен быць днём высьвятленьня дасягненьняў у галіне вытворчай каапэрацыі, асабліва спэцыяльных яе галін: малочных арцеляў, насенных, машынных, мэліарацыйных таварыстваў і г. д.

У гэта сьвята ўсе лепшыя арганізатары і асобы лепшых дасягненьняў пры соцыялістычных формах гаспадаркі павінны быць ушанованы ўсім грамадзянствам, як рэвалюцыянэры ў сялянскай гаспадарцы, як правадыры новае культуры ў вёсцы.

Камуністычная партыя і Савецкая ўлада ўжо шмат чаго зрабілі для падняцьця гаспадаркі беднякa і серадняка: надзел зямлёю быўшых батракоў, безьзямельных і малазямельных, данадзяленьне да нормы сераднякоў, зямляўпарадкаваньне, крэдытаваньне для адбудовы гаспадарак, сталая агранамічная і вэтэрынарная дапамога вёсцы і г. д.

Але ўсяго гэтага мы лічым, будзе мала, і будзе мала карысьці, калі тут ня будуць прыложаны самадзейнасьць і матар'яльныя сродкі самаго насельніцтва.

Мы ўжо дасканальна ведаем, што самая выгодная форма гаспадаркі—каляктыўная і што яна вельмі спрыяе беднаце і сераднякам. Аб'яднаўшыся ў вытворчыя каляктывы па апрацоўцы супольна зямлі, а таксама па перапрацоўцы малака, ільну і іншых прадуктаў, сяляне пры найменшай затраце працы, часу і сродкаў атрымаюць большы вынік, чым яны могуць атрымаць з паасобных гаспадарак.

Вядома, кожнаму бедняку хочацца хутчэй падняцца і стаць на ногі, але, па старынцы, яму здаецца, што, працуючы ў адзіночку, ён хутчэй папраўіцца, але гэта вельмі вялікая памылка некаторых сялян.

І вось, у „Дзень ураджаю" вельмі цікава будзе мець выразныя вынікі і дасягненьні аб гаспадараньні каляктыўным парадкам у параўнаньні з адзіночнымі гаспадаркамі.

Адначасова са сьвятам „Дню ўраджаю" павінны праводзіцца раённыя сельска-гаспадарчыя выстаўкі па галоўнейшых галінах мясцовай сельскай гаспадаркі. На выстаўках пажадана арганізаваць куткі экспонатаў сялян-дасьледчыкаў, Асо-авіахіму і Чырвонай арміі.

Працяг раённых сельска-гаспадарчых выставак пажаданы ня менш двух дзён, каб больш поўна выкарыстаць выстаўку для наведваньня сялянамі.

Найлепшыя экспанаты на раённых выстаўках будуць прэміравацца сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі і ганаровымі дыплёмамі, і выдавацца тут-жа на выстаўцы.

У сьвяткаваньні „Дню ўраджаю" сялянкі павінны прыняць актыўны ўдзел. Дэлегаткі-грамадчыцы, усе перадавыя сялянкі павінны быць на першым месцы.

Новыя культурныя і каляктыўныя формы сельскай гаспадаркі паляпшаюць жыцьцё сялянкі ў тым, што даюць большы прыбытак. Гэтыя формы гаспадараньня памагаюць сялянцы арганізавацца для палепшаньня свайго быту. Бядначкам і сераднячкам на пасёлкі ў арцелі, сябрам коопэрацыі лягчэй зарганізаваць ясьлі, дзіцячую пляцоўку, лягчэй ліквідаваць сваю няпісьменнасьць.

Вось чаму „Дзень ураджаю"—рэволюцыйнае сьвята ў сельскай гаспадарцы—павінна быць сьвятам сялянкі. У „Дзень ураджаю", сялянка павінна паказаць свае дасягненьні на культурным агародзе, ільнаводзве, жывёлагадоўлі і г. д.

Кожная сьвядомая бяднячка, сераднячка ў „Дзень ураджаю" павінна расказаць аб карысьці коопэрацыі, таварыства, малочнай арцелі, каляктыўнай апрацоўкі зямлі і г. д.

З боку камуністычнае партыі і Савецкай улады ствараюцца ўсе ўмовы і магчымасьці для падняцьця сельскае гаспадаркі, а якая праца зроблена ў гэтым напрамку селянінам, аграномам і коопэрацыяй—пакажа сьвята „Дню ўраджаю".

Валодзька.

БЕСЕДА ДОКТОРА

Анатомия, физиология и гигиена человеческого тела.

(Беседа 2-ая).

В первой беседе мы об'яснили, что это за науки анатомия, физиология и гигиена. Теперь мы приступаем к описанию устройства человеческого тела, т. е. к анатомии.

Части человеческого тела. Тело человека состоит из трех главных частей: из головы, туловища и конечностей (рук и ног). Голова соединена с туловищем при помощи шеи. Мы все отлично знаем, что все наше тело покрыто *кожей*. Если мы с человеческого трупа снимаем кожу, то под ней найдем слой *жира*. Этот слой у тучных людей бывает толстый, у худых—тонкий. Под жиром расположены мышцы или мускулы, т. е. то, что в обыденной жизни называют мясом. Эти мускулы прикреплены к костям. Все кости, вместе взятые, составляют *скелет*.

Кожа, мускулы и скелет представляют собою органы человеческого тела. Каждый из этих органов выполняет определенную работу или имеет свою определенную функцию. Так, например, кожа и ее подкожный слой, т. е. жир, защищает наши внутренние органы от холода, от ушибов и повреждений. Через кожу выделяется пот и другие вещества, что чрезвычайно полезно для организма. Мускулы имеют свою функцию, а именно: при их помощи части нашего тела имеют возможность двигаться. Скелет есть основа, подпора нашего тела; он служит защитой для всех наших мягких, нежных и очень важных органов. Без скелета, без этой твердой подпоры наши мягкие части, как кожа, мускулы и внутренности, так мозг, легкие, сердце и другие не могли-бы держаться в нашем организме. Костяные стенки защищают все эти внутренности от всяких повреждений. Так, например, череп защищает наш мозг, грудные стенки защищают сердце и легкие и т. п.

Клетки и ткани. Все живущее на свете, т. е. растения и животные, а также тело человека состоит из мельчайших телец, которые называются *клетками*. Отдельную клетку мы не можем видеть глазом, а можем ее видеть только при помощи особого прибора, который увеличивает предмет в сто и даже тысячу раз. Этот прибор состоит из нескольких увеличительных стекол и называется микроскопом. Если взять какой-нибудь кусочек нашего тела, например, кусочек кожи, или мускула или кусочек желудка и разрезать его на тончайшие слои и один такой тонкий слой рассмотреть через микроскоп, то увидим, что каждый такой кусок, а следовательно, все наше тело состоит из множества самых разнообразных клеток. Эти клетки имеют различную форму и строение. Они бывают круглые, овальные, цилиндрические, веретенообразные и т. п. Множество однородных клеток, соединенных между собою, образуют *ткань*.

Д-р М. Поляк.

(Продолжение будет).

Первая беседа была помещена в июльском номере „Бел. Раб. і Сял.".

Выдавец і рэдактар—**Аддзел работніц сялянак ЦК КПБ.**

НА ПЛЯЦОЎЦЫ.

Зелень. Чыстае паветра.
Сонца ярка сьвеціць.
Весела гуляюць
На пляцоўцы дзеці.
Тут няма нудоты,
Тут ня б'юцца, ня штурхаюць—
Кожны за работай,
Што каго цікавіць.
Рады дзеці (нібы птушкі—
Дзень за днём мінаюць),
А іх маткі дзесь у полі
Жыта дажынаюць.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

ЦЕНА 15 коп.

ПРИНИМАЕТСЯ ПОДПИСКА

НА ЕЖЕМЕСЯЧНЫЙ ЖУРНАЛ

„БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ:

На 1 месяц . .	15 к.	На 6 месяцев .	90 к.
„ 3 „ . .	45 к.	„ 1 год	1 р. 80 к.

Подписка принимается: в отделе по работе среди женщин ЦК КП(б)Б (Советская ул., 45), а также и во всех почтово-телеграфных отделениях Белоруссии и агентствах Белгосиздата

РАБОТНИЦА, КРЕСТЬЯНКА, ЖЕНА РАБОЧЕГО, КУСТАРКА, ДЕЛЕГАТКА, ВСЕ ТРУДЯЩИЕСЯ ЖЕНЩИНЫ МОГУТ И ДОЛЖНЫ ВЫПИСЫВАТЬ И РАСПРОСТРАНЯТЬ СВОЙ ЖУРНАЛ.